**Ю.В. Кішкурна (Мінск)**

## Праблема свабоды асобы ў яе гістарычнай абумоўленасці: вобраз Рагнеды ў ліра-эпасе ўсходніх славян

Праблемы ўзаемаадносін чалавека і свету, гістарычнай абумоўленасці становішча асобы, яе ўключанасці ў грамадска-сацыяльныя працэсы знаходзяцца ў цэнтры ўвагі як пісьменнікаў, так і навукоўцаў. Значную цікавасць у гэтым сэнсе выклікае праблема фарміравання нацыянальнай ментальнасці і ўклад канкрэтнай гістарычнай асобы ў працэс станаўлення генетычнага коду нацыі.

Асаблівае месца ў свядомасці беларусаў займае імя Рагнеды, якое асацыіруецца з Бацькаўшчынай, выступае сімвалам няскоранасці. Летапісная спадчына ўсходніх славян («Аповесць мінулых гадоў», Лаўрэнцьеўскі летапіс) звязвае з постаццю Рагнеды ўяўленні пра гонар, чалавечую годнасць, нязломнасць, справядлівасць. Гэтыя характаралагічныя дамінанты асобы знакамітай палачанкі пакладзены ў аснову ліра-эпічных твораў беларускіх, рускіх, украінскіх аўтараў. Увага пісьменнікаў да асобы Рагнеды невыпадковая: дачка першага гістарычна вядомага князя беларускіх зямель Рагвалода, жонка вялікага князя Кіеўскага Уладзіміра, маці кіеўскага князя Яраслава, празванага ў народзе Мудрым, першая манашка на тэрыторыі ўсходняга славянства, яна ўражвае незвычайна абвостраным пачуццём уласнай годнасці і духоўнай моцы, якія для жанчыны эпохі ранняга Сярэднявечча былі нехарактэрнымі. Паколькі «варыянты асэнсавання мінулага ў літаратуры супярэчлівыя, а вытлумачэнне крыніц рознымі аўтарамі бывае непадобнае, а іншым разам – і супрацьлеглае» [6, с. 196], то і вобраз Рагнеды ў ліра-эпасе разглядаецца ў залежнасці ад вызначанай аўтарамі яго канцэптуальнай функцыі. Тоеснасць поглядаў пісьменнікаў (рускага − К. Рылеева, украінскага − Т. Шаўчэнкі, беларускіх – Янкі Купалы, Т. Бондар, М. Багдановіч) на ўвасабленне вобраза Рагнеды заключаецца ў вырашэнні праблемы свабоды асобы, магчымасці яе самарэалізацыі ў пэўны гістарычны час. «Пільнае ўзіранне ў далеч часу непазбежна вядзе да адкрыцця сувязі асобнага чалавека з вялікім светам гераічнай і трагічнай мінуўшчыны» [7, с. 112], − слушна заўважае даследчык М. Тычына. Неабходна дадаць, што такое «ўзіранне» дае магчымасць праз адзінкавыя рэаліі выявіць заканамернасці, характэрныя для канкрэтнага народа.

Украінскі паэт Тарас Шаўчэнка ў цыкле «Цары» (1848), прысвечаным выкрыццю ўзурпатарства, бяздушнасці і амаральнасці ўладароў, у адной з частак звяртаецца да постаці Рагнеды. Полацкая князёўна паўстае бязвольнай ахвярай абставін, няздольнай на рашучыя дзеянні і супрацьстаянне злачынным учынкам Уладзіміра: «І растлі ю, / Рагнеду тую маладую, / І

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

пражне ю, і княжна / Па свеце блукае адна, / Не зробіць з ворагам нічога» [8, с. 302]. Праз выкарыстаны паэтам прыём кантрасту (у паказе жорсткасці кіеўскага князя і пасіўнасці гераіні) узмацняецца адчуванне поўнай залежнасці асобы ад гістарычных абставін, пацвярджаецца немагчымасць Рагнеды паўплываць на падзеі. Такое бачанне Т. Шаўчэнкам гісторыі жыцця полацкай князёўны абгрунтоўваецца імкненнем аўтара паказаць агульны для славянскіх народаў прыгнечаны лёс, скіраваць да роздуму і пошуку шляхоў барацьбы за свабоду.

Рускі паэт-дзекабрыст Кандрацій Рылееў адну са сваіх «дум» (гістарычны цыкл «Думы», 1821−1823) прысвяціў Рагнедзе. Сюжэтная канва твора адлюстроўвае гісторыю крывіцкіх зямель праз прызму светаадчування галоўнай гераіні. Нягледзячы на пакуты і выпрабаванні, Рагнеда паўстае ў творы непрымірымай і няскоранай, праз сына Ізяслава яна імкнецца закласці падмурак патрыятызму, свабодалюбства наступным пакаленням: «Пусть Рогволодов дух в тебя / Вдохнёт моё повествованье; / Пускай оно в груди младой / Зажжёт к делам великим рвенье» [5, с. 85]. Пачуццё асабістай годнасці, захаванне ўнутранай свабоды як адзіна магчымай у сітуацыі маральна-фізічнай прыгнечанасці паслужылі Рагнедзе своеасаблівым штуршком для вырашэння праблемы выбару на карысць барацьбы з віноўнікам яе няшчасцяў Уладзімірам: «На то, что мне повелевал / Ужасный Чернобог, − на мщенье!», «С каким восторгом бы тебя, / Тиран, угасшего узрела!..» [5, с. 90]. Беларускі крытык Р. Бярозкін, разглядаючы творчасць Я. Купалы, параўноўваў яго паэму «Гарыслава» з гістарычнай думай К. Рылеева. Адносна апошняй ён выказаў меркаванне, што «сваю асабістую трагедыю гераіня ўспрымае толькі ў сувязі з трагедыяй радзімы, на яе крывавым фоне» [3, с. 329]: «Ты брак свой совершил со мной / При зареве родного края!» [5, с. 90]. Варта падкрэсліць, што ў творы выразна выяўлена ўласнае бачанне Рагнедай прыярытэту маральнасці ў сферы асабістых адносін: «Вот страшный ряд ужасных дел, / Владимира покрывших славой! / Не через них ли приобрел / Ты на любовь Рогнеды право?..» [5, с. 90]. Самарэфлексія дазваляе галоўнай гераіні адкрыць ў сабе дадатковыя крыніцы духоўнасці («Страдала, мучилась, стеня, / Вся жизнь текла моя в кручине; / Но, боги! не роптала я / На вас в злосчастиях доныне!» [5, с. 90]), а значыць, адчуць сябе незалежнай ад штучных умоў існавання, створаных для яе Уладзімірам, прыйсці да разумення індывідуальнай чалавечай свабоды.

Паэма Янкі Купалы «Гарыслава» (1912) з'яўляецца першым творам, які адкрыў вобраз Рагнеды для беларускай літаратуры. Зачын паэмы і адна частка напісанага тэксту даюць падставы меркаваць, што за аснову сюжэтнага дзеяння было ўзята паданне пра Рагнеду, змешчанае ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лаўрэнцьеўскім летапісе. Янка Купала звяртаецца да вобраза Рагнеды з мэтай вырашэння ў першую чаргу праблемы свабоды Бацькаўшчыны: Рагнеда «няскораная, занесла меч над тым, хто зруйнаваў і паланіў яе родную зямлю і выступае сімвалам свабоды ў шырокім сэнсе слова» [1, с. 7]. Аўтар звяртаўся да сімвала свабоды чалавека, народа, імкнуўся паказаць прыклад, на які неабходна арыентавацца, дакараў сваіх сучаснікаў за абыякавасць да лёсу роднай зямлі: «Забыўся сын аб быўшай хвале, / Ў прыгон прадаў сябе, сям'ю. / Расою здоблючы чырвонай / Свае загоны і лугі, / Прыблуднай чэрні б'е паклоны, / Куе сабе сам ланцугі» [1, с. 18]. Рагнеда для Янкі Купалы перш за ўсё Асоба, Чалавек, а яе княская прыналежнасць толькі спрыяе фальклорнай рамантызацыі сімваліка-алегарычнага зместу, служыць дадатковым сродкам абуджэння нацыянальнай свядомасці. «Галоўнай сваёй місіяй як паэта-прарока, абуджальніка і натхняльніка творчага народнага духу Купала лічыў, − як адзначае даследчык Я. Гарадніцкі, − раскрыццё <…> прытоеных скарбаў. І найпершай умовай было духоўнае разняволенне чалавека, выбаўленне яго з-пад аблады як гнятлівых жыццёвых абставін, так і ўласнай духоўнай прыгнечанасці» [4, с. 90]. Галоўнай дамінантай гераіні Янкі Купалы з'яўляецца свабода: «Быль бывалую пра доч князеву, / Ту красавіцу ненаглядную, / Пра ту княжну пра свабодную…» [1, с. 17], Усведамленне чалавечай годнасці, паводле паэта, не залежыць ад грамадска-сацыяльных і гістарычных абставін: «…Стала звацiся Гарыславаю, / А гардыняй недаступнаю / Кругом-вокала праславілась» [1, с. 17]. Згаданы вышэй Р. Бярозкін лічыў творы Янкі Купалы і К. Рылеева, прысвечаныя асобе Рагнеды, аднолькавымі па ідэйнай накіраванасці, толькі з той розніцай, што ў беларускага паэта выразней акрэслена імкненне бачыць вольным свой народ. Агульнасць твораў бачыцца крытыку і ў наступным: «Не знайшла свайго выражэння ў творы тэма <…> любові-нянавісці і фатальнага паядынку душ. <…> І Рылееў таксама не надта высока ставіў падобныя калізіі» [4, с. 329]. Рагнеда ў Янкі Купалы выступае перш за ўсё светачам нацыянальнай свабоды, якая базіруеццца на гуманістычным ідэале індывідуальнай свабоды кожнага чалавека.

Таіса Бондар у паэме «Рагнеда» (1983) спрабуе знайсці вытокі духоўнай нязломнасці Рагнеды. На думку аўтаркі, повязь з роднай зямлёй і багатымі традыцыямі язычніцтва заклала ў Рагнедзе вольналюбівы пачатак, які быў акумуляваны выхаваннем бацькі Рагвалода: «У Рагвалода – Полацак, воля, / якую ён бараніць умее» [1, с. 189]. Па словах даследчыцы А. Фільковай, «аўтар успрымае Рагнеду як прадстаўніцу народа, як увасабленне яго фізічнай і духоўнай прыгажосці» [1, с. 10]. Падчас нападу войскаў Уладзіміра адбываецца эвалюцыя духоўнага стану князёўны, яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

імкнецца на поле бою, не ўяўляе сябе пераможанай духоўна, у самы страшны час трымаецца свайго ўнутранага стрыжня: «Рашуча яна / намацвае ножны. / І бліскае нож, / і падае цяжка / каса яе ў дождж» [1, с. 196]. Пазней Рагнеда не можа пазбавіцца ад духоўнага разлому: належаць чалавеку, якога ненавідзіш, неаднойчы нарадзіць ад яго, усёй свядомасцю адчуваць прысутнасць ката ў сваім жыцці і адначасова разумець, што гэта адзіны яе набытак. Усе надзеі і мары, пякучую любоў да роднай зямлі Рагнеда ўкладае ў сына. «Ён, як малады парастак, прарослы на папялішчы крывіцкай зямлі, нясе надзею на будучыя росквіт і незалежнасць Беларусі» [1, с. 13]. Прыняцце хрысціянскай ісціны служыць Рагнедзе-Анастасіі збаўленнем ад страху адзіноты, ад гневу, цяжару мінулага, а галоўнае − робіць яе свабоднай ад мужа і бяспраўнага жыцця: «Адвечнае – шукае ў новым, / шукае Бога над сабой» [1, с. 208]. Лёс і наканаванне Рагнеды (Гарыславы, Анастасіі) – гэта няспынная барацьба за волю, расплата і помста за зняважаны гонар, барацьба за асабістую свабоду, якая доўжылася ўсё жыццё.

Ірына Багдановіч у паэме «Палачанка» (1987) пры трактоўцы жыцця Рагнеды прытрымліваецца версіі, якая абапіраецца на летапісныя паданні. Ганарлівая, незалежная князёўна была выхавана на свабодалюбівых традыцыях, пачуццё ўласнай годнасці перадалося ёй ад продкаў: «Даўняй волі дзяўчына, − / княства вольнага кветка…» [1, с. 176]. Апынуўшыся ва ўладзе Уладзіміра, Рагнеда не мела іншага выбару, як трываць прымусовае становішча паланянкі («Лёс наложніцы да скону / Гатаваны, не ўцячы…» [1, с. 179]), аднак, нялюбая і занядбаная мужам, яна не страціла прыроджанага пачуцця справядлівасці, уласнага гонару, надзеі на вольнасць: «Думаў, забылася я, / Паланянка, / Што палачанка я? / Палачанка!..» [1, с. 181]. Адраджэнне традыцый і моцы дынастыі Рагвалодавічаў з’яўляецца для княгіні-чарніцы запаветнай марай, спадзяваннем на свабоднае ад прыгнёту існаванне сваіх нашчадкаў: «Выйдуць у людзі Рагнедзіны ўнукі – / Толькі ці ўспомняць басэтлі той гукі?» [1, с. 182]. У эпілогу твора вобраз Рагнеды выступае як абагульнены вобраз Радзімы, якая стагоддзямі праходзіць пакутным лёсам сваёй дачкі: «Не сплочаны Рагнедзіны даўгі ,/ Адным – баліць, а іншым – усё роўна» [1, с. 185].

Праблема гістарычнай абумоўленасці свабоды асобы ў суадносінах з вобразам Рагнеды вырашаецца ўсходне-славянскімі аўтарамі неадназначна. У сувязі з запатрабаваннямі часу пісьменнікі XIX стагоддзя К. Рылееў і Т. Шаўчэнка прыкладам індывідуальнага выбару гераіні падводзяць прыгнечаны народ да ідэі актыўнага адстойвання сваёй чалавечай годнасці і волі. Гэты матыў у больш завостранай форме гучыць на пачатку XX стагоддзя ў паэме Янкі Купалы. Сучасныя беларускія аўтары (Т. Бондар,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І. Багдановіч) бачаць у вобразе Рагнеды вытокі падсвядомай нацыянальнай прагі да справядлівасці, незалежнасці, волі. Знакаміты беларускі пісьменнік В. Быкаў сцвярджае свабоду як «найбольшую маральна-фізічную каштоўнасць, дадзеную кожнай жывой істоце фактам яе нараджэння» [2, с. 535]. Менавіта ўсведамленне чалавекам асабістай свабоды з'яўляецца галоўным аспектам разумення гэтага паняцця ў шырокім абагульненым сэнсе. У гэтай сувязі можна сцвярджаць, што вобраз Рагнеды ў ліра-эпасе ўсходніх славян адлюстроўвае залежнасць асобы ад ходу гістарычных падзей і сцвярджае магчымасць уласнай унутранай свабоды.

Літаратура


1. Бацькаўшчына : зб. гіст. літ. ; уклад., прадм., паслясл. С. Панізніка. – Мінск : Юнацтва, 1999. – 367 с.
2. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому : кніга ўспамінаў / В. Быкаў. – Мінск : ГА БТ «Кніга», 2004. – 544 с.
3. Бярозкін, Р. Свет Купалы; Звенні : літ. крытыка. Выбранае / Р. Бярозкін. − Мінск : Маст. літ., 1981. – 572 с.
4. Гарадніцкі, Я.А. Паэтыка беларускай літаратуры XX стагоддзя: суб'ектна-аб'ектныя суадносіны / Я.А. Гарадніцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 332 с.
5. Рылеев, К.Ф. Стихотворения. Статьи. Очерки / К.Ф. Рылеев. – М. : Худ. лит., 1956. – 445 с.
6. Тарасаў, К. Падзеі гісторыі і версіі літаратуры / К. Тарасаў // Полымя. – 1988. – № 2. – С. 195–204.
7. Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай літаратуры / М.А. Тычына [і інш.] ; навук. рэд. М.А. Тычына. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – 459 с.
8. Шаўчэнка, Т. Вершы. Паэмы : з укр. / Т. Шаўчэнка. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 462 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ